## § 42. Сказы з адасобленымі дапаўненнямі, знакі прыпынку

Дапаўненні, выражаныя назоўнікамі або займеннікамі ва ўскосных склонах з прыназоўнікамі ***акрамя, апрача, замест, за выключэннем,*** маюць удакладняльнае значэнне і заўсёды а д а с а б л я ю ц ц а. Такія дапаўненні паказваюць на ўключэнне ў лік ці выключэнне прадмета (з’явы) з ліку іншых або на замяшчэнне яго: *На свеце ўсё знойдзеш, **апрача бацькі і маці*** (Прыказка). *На голых дрэвах, **замест лісця**, паклалі шэрань маразы* (Я. Колас).

Пры вымаўленні адасобленыя дапаўненні выдзяляюцца паўзай і паніжэннем голасу, а на пісьме коскамі.

З а ў в а г а. Дапаўненне з прыназоўнікам ***замест*** не адасабляецца, калі прыназоўнік мае значэнне ‘за’. Параўн.: *Сёння Міхась дзяжурыў замест сябра. — Сёння Міхась дзяжурыў за сябра.*

Адасабляюцца ўдакладняльныя спалучэнні, якія пачынаюцца словамі ***асабліва, нават, пераважна, у тым ліку, у прыватнасці, напрыклад*** і інш. Яны надаюць удакладненню сэнсавае адценне выдзяляльнасці, узмацняльнасці: *Многія, **асабліва мужчыны**, так і не вярнуліся з вайны* (А. Асіпенка). *Ніхто, **нават вецер**, не кранае галін яблынь і груш у белай квецені* (П. Пестрак). *Уперадзе каля самай дарогі стаяў лясок, **пераважна бярозавы*** (Я. Колас).

З а ў в а г а. Калі словы *асабліва, нават, пераважна* не маюць удакладняльнага значэння, перад імі коска не ставіцца: *Лес пераважна хваёвы. На двары ціха, спакойна, не мігцяць нават далёкія агні. Дзень быў асабліва цёплы.*

**348.** Прачытайце сказы. Знайдзіце ў іх адасобленыя дапаўненні з удакладняльным значэннем. З якімі прыназоўнікамі яны ўжыты? Спішыце сказы, падкрэсліце адасобленыя ўдакладняльныя дапаўненні.

1. Не, у Марынкі, акрамя яе вонкавай прыгажосці, было нешта сваё *(Т. Хадкевіч)*. 2. Акрамя кучаравых бярозак, на ўзгорку[сл]



Правообладатель Национальный институт образования

расла высокая сухаверхая хвоя *(З. Бядуля)*. 3. Увесь дзень, за выключэннем перапынку[а] на абед і снеданне, быў прызначаны агляду[а] калгаснай гаспадаркі[п] *(Я. Колас)*. 4. Раней існавала памылковае ўяўленне аб тым, быццам на Беларусі няма нічога, апрача торфу[а] *(В. Вольскі)*.

**349.** Спішыце сказы, устаўляючы прапушчаныя літары, растлумачце іх правапіс. Расстаўце, дзе трэба, знакі прыпынку і абгрунтуйце іх пастаноўку.

1. Над Беларус..ю ноч была, пажар гуляў[с] замест заранкі *(П. Броўка)*. 2. У той вечар для Косціка апрача кніг нічога не было даражэйшага на свеце[сн] *(С. Александровіч)*. 3. Ад зямлі награваецца[с] паветра асабліва яго ніжнія слаі[сн] *(А. Звонак)*. 4. Глуха[сл], непрытульна ў лесе зімой асабліва ў снежную зам..ць[сн] *(М. Лынькоў)*. 5. Даўно ўжо не было такога непастаяннага надвор'я, як сёлета: апошнія часы за выключэннем некалькіх марозных дзён неба хмурнае і часта ідуць[м] дажджы *(У. Караткевіч)*.

**350.** Спішыце сказы, устаўляючы замест кропак патрэбныя па сэнсе ўдакладняльныя дапаўненні. Афарміце сказы ў адпаведнасці з пунктуацыйнымі нормамі.

1. Увесь месяц ... ішлі халодныя дажджы. 2. Мая старэйшая сястра ... захапляецца бальнымі танцамі. 3. З бакоў ... вуліца абсаджана ліпамі. 4. Увесь дзень ... мы працавалі ў бібліятэцы. 5. У лесе ... многа суніц. 6. Усё іншае ... доктар высвятляў пасля агляду хворага. 7. У рацэ ... было багата ракаў.

Д л я  д а в е д к і: *акрамя аэробікі; у тым ліку і прозвішча; апрача чарніц; за выключэннем перапынку на абед; апрача садоў і кветнікаў; акрамя рыбы; за выключэннем сямі-васьмі дзён.*

**351.** Складзіце і запішыце сказы з наступнымі адасобленымі дапаўненнямі: *за выключэннем адсутных, замест запланаванай экскурсіі ў Мірскі замак, апрача футбола, у адрозненне ад майго сябра*. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў запісаных вамі сказах.



Правообладатель Национальный институт образования